Спорт-тайм

# ТУРНІР У МІНСКУ СТАНЕ КЛЮЧАВЫМ ЭТАПАМ АДБОРУ НА АЛІМПІЯДУ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра найбольш актуальныя падзеі выхадных.**

**1.** ***Адбыліся матчы 7-га тура чэмпіянату краіны па футболе.*** Салігорскі «Шахцёр» атрымаў буйную перамогу над футбалістамі «Іслачы» — 4:0, «Белшына» (Бабруйск) саступіла «Дынама» (Брэст) — 0:3. Вынікі астатніх сустрэч: «Віцебск» — «Славія» (Мазыр) — 2:3, «Мінск» — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) — 2:5, «Рух» (Брэст) — «Гарадзея» — 1:1, «Смалявічы» — «Энергетык-БДУ» (Мінск) — 0:2, «Дынама» (Мінск) — «Слуцк» — 1:2, БАТЭ — «Нёман» (Гродна) — 3:1.

Турнірнае становішча пасля сямі тураў: «Слуцк» — 16 ачкоў, «Тарпеда-БелАЗ» — 14, БАТЭ — 13, «Іслач», «Энергетык-БДУ» — па 12, «Шахцёр» — 11, «Славія», «Віцебск», «Гарадзея», «Дынама» (Брэст) — па 10, «Дынама» (Мінск), «Мінск», «Рух» — па 9, «Нёман» — 8, «Смалявічы» — 3, «Белшына» — 2.



Спіс найлепшых бамбардзіраў узначальваюць Валерый Гарбачык («Тарпеда-БелАЗ»), Гегам Кадзімян («Нёман»), Яўген Шыкаўка («Дынама», Мінск), Джасурбек Яхшыбаеў («Энергетык-БДУ»), якія забілі па чатыры мячы.

Наступны тур чэмпіянату пройдзе 8–10 мая.

**2.** ***Беларускі трэнер Андрэй Скабелка ўзначаліў яраслаўскі «Лакаматыў».*** Такая інфармацыя змешчана на афіцыйным сайце клуба Кантынентальнай хакейнай лігі. Кантракт разлічаны на тры гады. Нагадаем, раней Андрэй Скабелка працаваў з «Гомелем», які пад яго кіраўніцтвам заняў трэцяе месца ў чэмпіянаце Беларусі (2010). Таксама ў яго трэнерскай кар'еры былі «Тарпеда» (Ніжні Ноўгарад), «Сібір» (Новасібірск), «Авангард» (Омск). Апошнім месцам работы беларуса, які ў 2016 і 2019 гадах станавіўся найлепшым трэнерам краіны, быў казахстанскі «Барыс». Два сезоны запар каманда аказвалася на другім месцы ва Усходняй канферэнцыі па выніках рэгулярнага чэмпіянату КХЛ і двойчы даходзіла да другога раўнда плэй-оф. Таксама Андрэй Скабелка займаў пасады галоўнага трэнера зборных Беларусі і Казахстана.



**3.** ***Сусветныя пляжныя гульні, якія планаваліся на 2021 год, перанесены на 2023-і.*** Такое рашэнне прынята Асацыяцыяй нацыянальных алімпійскіх камітэтаў. У студзені АНАК пачала прыём заявак на правядзенне Сусветных пляжных гульняў 2021 і 2023 гадоў, але з-за распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі і пераносу летніх Алімпійскіх гульняў у Токіа сусветны спартыўны каляндар зведаў значныя змены. Арганізоўваць яшчэ адны комплексныя спаборніцтвы ў шчыльным графіку 2021 года праблематычна, лічаць у асацыяцыі. «Сусветныя пляжныя гульні створаны спецыяльна для нацыянальных алімпійскіх камітэтаў і іх спартсменаў, каб прыцягваць да турніраў новыя пакаленні атлетаў па розных відах спорту і балельшчыкаў. Услед за летнімі Гульнямі ў Токіа ў 2021 годзе стартуюць зімовыя, гэта вялікая нагрузка на спартыўныя арганізацыі», — адзначыў выканаўца абавязкаў прэзідэнта АНАК Робін Мітчэл.

**4.** ***Чэмпіянат свету па сучасным пяціборʼі ў Мінску, які пройдзе з 7 да 13 чэрвеня 2021 года, стане заключным этапам адбору на XXXII Алімпійскія гульні ў Токіа.*** Такое рашэнне прынята Міжнародным саюзам сучаснага пяціборʼя. Прэзідэнт UIPM Клаус Шорман, наведаўшы з афіцыйным візітам НАК Беларусі ў сакавіку, адзначыў, што мінскі сусветны форум можа стаць адным з самых важных для развіцця гэтага віду спорту. Амаль праз два месяцы саюз апублікаваў новую сістэму кваліфікацыі, згодна з якой мінскі чэмпіянат набывае статус ключавога турніру ў сезоне. Адзначаецца, што ўсе спартсмены, якія заваявалі алімпійскія ліцэнзіі на спаборніцтвах 2019 года, застаюцца іх уладальнікамі. Усе кваліфікацыйныя ачкі, набраныя да моманту спынення спаборніцтваў, будуць залічаны ў сусветны алімпійскі рэйтынг.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.25 | 20.49 | 15.24 |
| Віцебск — | 5.09 | 20.43 | 15.34 |
| Магілёў — | 5.15 | 20.39 | 15.24 |
| Гомель — | 5.17 | 20.30 | 15.13 |
| Гродна — | 5.41 | 21.03 | 15.22 |
| Брэст — | 5.47 | 20.58 | 15.11 |

### Месяц

*Першая квадра 30 красавіка.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

### Імяніны

***Пр.*** *Віталя, Гаўрылы, Клімента, Лукі, Усевалада, Фёдара.*
***К.*** *Ірэны, Тамары, Вінцэнта, Тодара.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 5 МАЯ

У краіне

**1825** год — нарадзіўся (Літва) Фадзей Антонавіч Гарэцкі, мастак. Творчасць звязана з культурным жыццём Беларусі, Расіі і Польшчы. Вучыўся ў Вільні у Валенція Ваньковіча, у Пецярбургскай акадэміі мастацтваў у Карла Брулова, якому дапамагаў у выкананні роспісаў у Ісакіеўскім саборы ў Пецярбургу. У 1848–1849 гадах і ў 1855-м жыў на Віцебшчыне, з 1856-га — пераважна ў Парыжы. Аўтар жанравых палотнаў «Апошняе прычашчэнне», «Споведзь маладой дзяўчыны ў ксяндза», «Хрыстос блаславіляе дзяцей», партрэтаў Адама Міцкевіча, Пятра Клота, пейзажаў.

**1940** год — нарадзіўся Алефцін Мікалаевіч Калабаеў, беларускі вучоны ў галіне гідратэхнікі, воднай гаспадаркі і экалогіі, доктар тэхнічных навук (1986), прафесар (2006). У 1962-м скончыў БПІ. Працаваў у Цэнтральным НДІ комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў, з 2003 года ў БНТУ. Аўтар навуковых прац па спосабах і метадах вядзення воднага кадастра, інфармацыйных сістэм воднай экалогіі.



У свеце

**1815** год — нарадзіўся Эжэн Марэн Лабіш, французскі камедыёграф. Аўтар п'ес, вадэвіляў, самыя вядомыя з якіх — у тым ліку «Саламяны капялюшык» і «Падарожжа спадара Перышона».

**1880** год — нарадзіўся Міхаіл Міхайлавіч Фокін, рускі артыст балета, балетмайстар і педагог, кіраўнік балетнай трупы «Рускіх сезонаў» у Парыжы (1909–1912, 1914).



**1915** год — нарадзіўся Яўген Аронавіч Далматоўскі, расійскі паэт. Лаўрэат Сталінскай прэміі (1950).

**1930** год — нарадзіўся Леанід Іванавіч Абалкін, расійскі вучоны ў галіне праблем эканомікі, навуковы кіраўнік Інстытута эканомікі РАН, акадэмік РАН, замежны член НАН Беларусі (2000).

**1940** год — нарадзіўся Ліён Майсеевіч Ізмайлаў, расійскі пісьменнік-сатырык, артыст эстрады.

**1945** год — саюзныя войскі цалкам вызвалілі тэрыторыю Даніі і Нідэрландаў ад фашысцкай акупацыі.

У гэты ж дзень пачалося Пражскае ўзброенае паўстанне супраць гітлераўскіх акупантаў, якое стала адной з самых яркіх старонак чэшскага Супраціву. Танкавая брыгада арміі ЗША вызваліла вязняў нямецка-фашысцкага канцлагера Маўтхаўзен на тэрыторыі Аўстрыі.

**1955** год — уступіла ў сілу Еўрапейская культурная канвенцыя.

Так гаварыў...

**РЭМАРК:**

*«Смерць аднаго чалавека — гэта смерць, смерць двух мільёнаў — толькі статыстыка».*

## УСМІХНЕМСЯ

— Павел, вы так падобны на майго трэцяга мужа!
— А колькі іх у вас было?
— Два.

**— Любачка, ты ўся такая паветраная...**
**— Як бізэ?**
**— Як трывога.**

— Каханы, давай сходзім у цырк.
— Навошта?
— Паглядзім на нашы стасункі з боку.

**— Дзяніс, а ты падчас сексу з жонкай размаўляеш?**
**— А што, Мікіта, рабіць? Раз тэлефануе — трэба адказваць.**

— Лявон, колькі ты будзеш швэндацца па бабах! У нас ужо трое дзяцей, і ніводнага ад цябе!

**— Ведаеш, гэта такое прыемнае адчуванне, калі купіла штосьці, што табе зусім не патрэбнае, але на душы так цёпла, што яно ў цябе ёсць...**
**— Я цябе разумею, я так замуж выйшла.**





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1433.

Нумар падпісаны ў 19.30 4 мая 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12